Казка за казкай

# Буслiны востраў



Балгарская казка

Казка за казкай

# Буслiны востраў

БАЛГАРСКАЯ КАЗКА

Мiнск «Юнацтва» 1991

ББК 84.4Бл
Б92

Серыя заснавана ў 1981 годзе

Жил в одном селе крестьянин с женой, дочкой Босилкой и сыном Силяном. Отец с матерью в сыне души не чаяли, совсем забаловали его. Вся семья при деле, только Силян с утра до вечера по ярмарке слоняется с такими же, как сам, друзьями-гуляками. Наконец он совсем ушел из дому...

Какие невзгоды выпали на долю Силяна и как он опять вернулся в родное село, и рассказывается в этой сказке.

Пераклаў на беларускую мову С. Міхальчук

Мастак Я. Равякоў

Б $\frac{4804010400—085}{М\ 307(03)—91}$ 113—90

ISBN 5-7880-0419-5

© Перакладчык С. Міхальчук, 1991
© Мастак Я. Равякоў, 1991



Вось што людзі расказваюць, дзяды ўнукам пераказваюць.

Жыў-быў на свеце селянін. Звалі яго Бажын. Жыў са сваёю сям'ёю, не вялікаю і не малою. Ён сам, ды жонка, ды двое дзетак — дачка Басілка і сын Сілян.

Бацька з маці сына вельмі любілі, душы ў ім не чулі. Кавалачак смачнейшы — яму аддаюць. Самі на досвітку падымаюцца, сына пабудзіць шкадуюць. Зусім распесцілі. Пачаў Сілян у школу хадзіць — настаўнікаў не слухаецца, урокаў не вучыць. Яму толькі б на рэчку бегаць, рыбу лавіць ды купацца.

Бацька з маці між сабою гавораць:

— Сялянская праца цяжкая, наробіцца яшчэ. Няхай пакуль што пагуляе.

Рос-падрастаў Сілян, вырас прыгожы ды зграбны. А карысці з яго ніякай ні дома, ні ў полі. Толькі і ведае, што падбухторвае іншых хлопцаў на розныя штучкі, ды вечарамі, калі людзі напрацуюцца і спяць, песні на ўсё сяло гарланіць.

Тут бацька з маці і задумаліся: што з шалапутным сынком рабіць?

— Можа, ажэнім яго? — кажа бацька.

— І праўда,— зарадавалася маці.— Ажэніцца — пераменіцца.

Высваталі яму самую лепшую дзяўчыну ў сяле, красуню ды рукадзельніцу, і ў полі і дома працаўніцу.

Хоць і ажаніўся Сілян, а ўсё роўна не перамяніўся. Бацька арэ, сее, маладая жонка Нэда ды Сілянава сястра Басілка жнуць, з гаспадаркай уходжваюцца,





маці снеданне, абед, вячэру гатуе — усе работаю заняты. Адзін Сілян з саменькай раніцы на кірмашы сноўдаецца з гэтакімі ж, як сам, сябрукамі-гулякамі.

Год гэтак мінуў. Нарадзіла Нэда Сіляну сынка. Назвалі яго Велка. Тут бы Сіляну адумацца, ды куды там — яшчэ больш загуляў. А вернецца апоўначы — жонка плача, сястра ўздыхае, маці ўгаворвае, бацька сварыцца.

— Зусім жыцця няма,— сказаў аднойчы Сілян.— Прыйдзеш дадому стомлены, тут бы адпачыць, а цябе поедам ядуць. Пайду ад іх. Няхай жывуць як хочуць, і я — як хачу.

І пайшоў.

Далекавата ад іх сяла горад быў, але Сілян ног не пашкадаваў, дабраўся да горада, у карчму падаўся. Грошы ў яго ў той час яшчэ ў кішэні пазвоньвалі. На гэты звон і сябрукі знайшліся, наляцелі, як мухі на мёд. Дзень весяліўся Сілян, другі бaляваў, а на трэці і грашам і сяброўству канец.



А горад — не бацька з маці, ніхто кавалка хлеба дарма не дасць. Пачаў галадаць Сілян. Дзеноймецца дроў накалоць, дзе гліну на будоўлі мясіць. Менш заробіць — праесць, крыху больш заробіць — прап'е.

Так і бягуць дні за днямі. Думаў Сілян, у горадзе яго вясёлае, лёгкае жыццё чакае, а тут вунь як усё павярнулася.

Пайшоў ён неяк раз у горад Салонікі. Парашыў свет пабачыць, на людзей паглядзець. А ў Салоніках у гавані пavailableруснікаў поўна, ад суднаў з доўгімі вёсламі на вадзе цесна. Наняўся Сілян на карабель матросам, і назаўтра ж раніцай карабель адплыў.

Не дзень, не два нёс іх вецер і з кожным днём усё мацнеў ды мацнеў. А пасярод мора разгулялася страшэнная бура. Хвалі кідалі судна з боку на бок, забаўляліся з ім, нібы кот з мышкай. Карабель то ўгору ўзнімала, то ўніз шпурляла. Сарвала руль і парусы,





мачты пакрышыла-паламала. А потым ударыла судна аб скалу і зусім на трэскі разбіла.

У той страшны час усе патапіліся. Аднаму Сіляну ўдалося ўратавацца. Ён паспеў ухапіцца за вялікую дошку, успоўз на яе, рукамі-нагамі ўчапіўся.

Доўга яго насіла па моры ці не, ён не ведаў, не памятаў. Дождж яго сек, сонца пякло, думаў — зусім прападзе. А ўсё-такі суцішылася бура, вынесла дошку на бераг і Сіляна з ёю.

Ляжыць Сілян знясілены на цвёрдай зямлі, і ўсё яму здаецца, што пад ім хвалі ходзяць. Адлежаўся, устаў і паплёўся куды вочы глядзяць, абы толькі чым далей ад мора. Прайшоў колькі там, зноў перад ім



2 Зак. 2964

мора паблісквае. Павярнуў у другі бок, ішоў, ішоў і зноў да мора выйшаў.

«Не інакш, я на востраў трапіў,— думае Сілян.— Ды ці жыве хоць хто тут? Штосьці і дымком не пахне, і сабакі не брэшуць, і пеўні не спяваюць. Раптам я адзін-адзінюткі на гэтай зямлі сярод мора?!»

А ўжо і ноч насоўваецца. Знайшоў Сілян невялічкую пячору над ручаём, папіў вадзіцы, ягадамі ажыны, што на схіле расла, прагнаў трошкі голад і ўлёгся. Як можа спаць згаладалы, акалелы чалавек на чужой зямлі з каменем пад галавой, гэтак і Сілян спаў — усю ноч дрыжаў, вачэй не звёў.

Вось калі праняло ўрэшце Сіляна! Успомніў ён роднае сяло, бацьку з маці, ласкавую жонку з сынком, добрую сястру. Ці давядзецца зноў пабачыцца з імі? Ці так і загіне ён тут, на чужыне?!

Доўга сумныя думы думаюцца, а ноч яшчэ даўжэй цягнецца. Нарэшце заняўся золак.

Узабраўся Сілян на гару. Агледзеўся навокал. Во радасць! Унізе паміж гарой і пагоркам, у далінцы, палеткі ўзараныя, а паўз палеткі дарога ўецца. Значыцца, не пустэльны востраў, жывуць тут людзі! Пабег па схіле, быццам крылы ў яго выраслі. На дарогу ступіў, пакрочыў наперад.

Толькі абмінуў пагорак, убачыў: на лужку муж з жонкаю сена косяць. Кінуўся да іх Сілян, ды прыпыніўся.

«Як,— думае,— з імі загаварыць? Па-нашаму, па-балгарску? Ды адкуль тут, на востраве сярод мора, балгарам узяцца! А калі яны туркі, або грэкі,





або яшчэ хто — яны мяне не зразумеюць, я іх не зразумею. Будзем перагаворвацца, як сляпы з глухім. Але ўсё ж людзі яны, не ваўкі, як-небудзь дамовімся».

Тут раптам жанчына засмяялася, павярнулася да мужа і сказала:

— Зірні, мужычок, няйначай, Сілян да нас ідзе!

— І праўда, Сілян,— муж адказвае.— Якім толькі ветрам яго сюды занесла?



Здзівіўся Сілян. Мала таго, што гэтыя людзі пабалгарску гавораць, яны яшчэ яго і па імені называюць. Ну і дзівосы!

Мужчына абцёр касу травою, адклаў убок.

— Што ж, Сілян, адкуль бы ты ні ўзяўся, з неба ці з мора, нашым госцем будзеш. Хадзем з намі.

Прывялі яго ў невялікае паселішча. Дзеці насустрач высыпалі, закрычалі звонкімі галасамі:

— Сілян прыйшоў! Сілян прыйшоў!



Сілян яшчэ больш дзівіцца:

— І дзеці мяне ведаюць! А я іх нікога і ў вочы не бачыў.

Гаспадары пасадзілі Сіляна на пачэснае месца за сталом. Частуюць. Пачалі суседзі сыходзіцца, і кожны, як вітаецца, яго па імені называе. А самы стары дзед узяўся распытваць:

— Ну што, Сілян, дзе быў-прападаў? Ці не кінуў піць-гуляць? Маці па табе вочы выплакала. Маладая жонка Нэда пры жывым мужу горкай удавою гаруе. А сынок Велка сіратою расце. Можа, твой бацька Бажын хоць ад унука дачакаецца помачы.

Пакаціліся тут у Сіляна з вачэй горкія слёзы.

— Каб мне ў родныя мясціны давялося вярнуцца, усё інакш бы пайшло. Толькі як туды дабрацца? Мо караблём, што да вострава прычаліць?

— Не, Сілян, не заходзяць сюды караблі. У баку ад гандлёвых шляхоў гэты востраў ляжыць. І акружаюць яго мелі, скалы ды віры. Гэта ж і той карабель, на якім ты плыў, аб нашы камяні на трэскі разбіла.

— А як жа вы самі сюды трапілі?! — закрычаў Сілян.— І адкуль мяне і ўсю нашу сям'ю ведаеце?

— Як жа нам не ведаць! Мы ўсе з табою з аднаго сяла родам. Усё ваша жыццё нам як на далоні відаць. А сюды на востраў прыносяць нас шырокія крылы. Мы ж буслы, Сілян.

— Буслы? Нічога не разумею! — кажа Сілян.— Хіба ж буслы аруць і сеюць, па-балгарску гавораць? Не бывае такога на свеце!

— Бывае не бывае,— адказвае стары,— а што было, тое было. Калі хочаш, паслухай. Раскажу я табе не казку, не байку, а чыстую праўду.

Даўно гэта здарылася. Мой дзед тады яшчэ хлапчуком басанож бегаў. І такім дурасліўцам рос, яшчэ горшым за цябе. Збярэ гурт хлопчыкаў ды дзяўчынак, па садах у яблыкі лазяць, вулеі на пчальніках перакульваюць, сабакам да хвастоў чарапкі прывязваюць. Не было на іх ніякае рады. Аднойчы зайшоў у сяло дзед-жабрак. Пачалі дзеці яго дражніць, за кашулю, за торбу тузаць. Раззлаваўся стары ды і агрэў кіем аднаго, другога. Дзеці адбегліся, пачалі



ў яго камянямі шпурляць. І пацэліў камень яму ў галаву, якраз у скроню. Упаў стары і памёр. А перад тым як апошні раз уздыхнуць, паспеў іх закляць страшным закляццем: «Не ўмелі вы сярод людзей людзьмі жыць, дык будзьце бусламі. А зрабіцца людзьмі здолееце толькі там, дзе, апрача вас, людзей не будзе, на пустэльным востраве сярод мора. Непарушны мой праклён на векі вякоў!»

Як сказаў стары, так і сталася. У той жа міг выраслі ў дзяцей крылы, узняліся яны ў паветра і паляцелі. Куды — самі не ведалі. Прынёс іх вецер на гэты востраў. Пасярод вострава з-пад скалы цякуць два ручаі: адзін ручай з чалавечай вадой, другі з буслінай. Пакупаемся ў першым — людзьмі робімся. Тут, на востраве, час бавім. А як у наш край, Балгарыю, у роднае сяло вясна прыйдзе, пачынае нас мучыць туга неадольная. Тады акунёмся мы ў ручай з буслінай вадою, зробімся бусламі і ляцім на радзіму. Там наш дом, там і жывём да глыбокай восені.

— Дзядуля, а мне можна зрабіцца буслам? — спытаў Сілян.

— Чаму ж не,— адказаў стары.

— Дык пакажы мне хутчэй, дзе запаветныя ручаі,— пачаў прасіць-маліць Сілян.— Зраблюся буслам, палячу на лёгкіх крылах у родны край.

— Не, Сілян,— кажа стары,— там, у Балгарыі, цяпер зіма, а мы, буслы, птушкі да холаду нязвыклыя. Аднаму табе не даляцець. Не наезджаны ў моры дарогі, ды і ў небе шлях не пракладзены. Прыйдзе пара, усёй чарадой узнімемся, і ты з намі.

Застаўся Сілян жыць у буслінным сяле. Каму што ў гаспадарцы памагчы трэба — ён першы. Сена ў копы складаў, збажыну жаў. Быццам падмянілі Сіляна, зусім другім чалавекам стаў, сам сябе не пазнае.

Так і мінаў час — удзень на рабоце, ноччу ў тузе і нэндзе.

Раптам занепакоіліся людзі-буслы. На неба пазіраюць, вочы ва ўсіх трывожныя, любая работа з рук валіцца. А аднойчы раніцай, на самым золку, крык пачуўся:

— Пара ў дарогу! Пара!

У Сіляна сэрца ад радасці закалацілася, і адразу ж яго быццам ледзяною рукою сціснула. Кінуўся ён да старога дзеда, скрозь слёзы загаварыў:



— Скажы, дзядуля, што мне рабіць? Як у бусла ператварыцца — ты мяне навучыў, а як чалавекам у родным сяле зрабіцца ды застацца — не ведаю. Ці не параіш мне што-небудзь?

— А ты вось што, Сілян,— адказвае дзед,— вазьмі збаночак, набяры ў яго вады з чалавечага ручая ды павесь на шыю. Прыляціш дадому, апырскаешся тою вадою, сам сабою станеш. На табе ж няма закляцця на векі вякоў непарушнага.

Тры дні і тры ночы ляцелі буслы над морам. Сілян-бусел ледзьве крыламі махае, ніжэй за ўсіх ляціць. Зусім з сілы выбіўся, вось-вось адстане. Ды тут якраз цвёрдую зямлю ўбачылі. Адпачылі буслы на крутым беразе, далей паляцелі.

А як паказалася ўдалечыні роднае сяло — ад-



куль толькі і сіла ўзялася! — вырваўся Сілян-бусел наперад, пра ўсё ад радасці забыўся, рынуўся стрымгалоў да бацькоўскага двара. Ды не ўсцярогся: гліняны яго збаночак стукнуўся аб камень і разбіўся. Уся чалавечая вада ў зямлю пайшла. Заплакаў бы Сілян, ды буслы плакаць не ўмеюць. Узмахнуў небарака стомленымі крыламі, узляцеў на дах роднага дома, а там у гняздзе ўжо сядзіць стары бусел, той, што на востраве самым старым дзедам быў.

Затрашчаў бусел дзюбай, нібы салдат палачкамі па барабане застукаў. Сілян усё зразумеў:

— Маё гэта гняздо, спрадвеку тут сялюся. А ты, Сілян, вунь на свірне ўладкоўвайся. Твой бацька Бажын і туды кола ад разбітых калёсаў прыладзіў.

Звіў сабе гняздо на тым коле Сілян-бусел, стаў у ім на доўгіх нагах, на двор пазірае. Бачыць — маці карову доіць, маладая жонка Нэда авечак у хлеў заганяе, сястра Басілка ў ачагу агонь распальвае — вячэру гатуе. А сынок Велка паміж імі круціцца, светлая яго галоўка то тут, то там мільгае.

Захацелася Сіляну сына лепей разгледзець, зляцеў ён з гнязда на двор. А Велка яго за хвост схапіў, весела закрычаў:

— Гляньце, гляньце, я бусла злавіў! Залыгаю яго на вяроўку, буду з ім гуляць, за сабою вадзіць.

Тут якраз бацька Сіляна, Бажын, з поля вярнуўся. Пачуў, што Велка крычыць, і сказаў:

— Адпусці бусла, унучак. Бусел птушка добрая, нікому зла не робіць.

Велка паслухаўся дзеда.





Так і пачаў Сілян-бусел жыць — і пры доме і не дома, са сваімі і не свой.

Вось аднойчы паехаў Бажын поле араць і ўнука з сабою ўзяў, валоў паганяць, да работы прывучаць. Узняўся Сілян-бусел з даху ды за імі паляцеў. Апусціўся чым бліжэй да сынка, ходзіць па баразне.

Велка ўбачыў, закрычаў:

— Дзядуля, дзядуля, гэта наш бусел! Я пазнаў яго.

— Няхай сабе ходзіць, унучак. Ён нам не замінае.

Пачалі араць. Велка не так валоў паганяе, як усё на бусла азіраецца, валоў з роўнага кроку збівае, баразна крыва ідзе. Дзед раззлаваўся, хацеў бусла



адагнаць, шпурнуў у яго бок грудкай зямлі ды, як на тую бяду, пацэліў, нагу яму выцяў.

Паляцеў бусел у гняздо, выцятую нагу падкурчыў, скрыпіць дзюбаю ад болю.

Увечары сабралася сям'я на двары каля летняга ачага за вячэрай. Велка і кажа маці:

— Мама, сёння наш бусел прыляцеў на поле, дзе мы аралі, а дзядуля яму грудкай нагу выцяў.

Дзед сказаў:

— Ага, нядобра выйшла. А ўсё Велка вінаваты. Навошта на птушку азіраўся, пра валоў забываўся. Я на хлапчука раззлаваўся, хацеў бусла адагнаць.

Тут Велка зноў абазваўся:

— На мяне раззлаваўся, дык хай бы мяне і біў!..



Сілян-бусел з даху ўсё бачыць, усё чуе. І горка яму і радасна, нават нага менш балець стала.

Неяк раз сястра Басілка сядзела пад явара і нізала маністы з маленькіх манет. Раптам расчыніліся вароты, у двор заехалі сваты з жаніхом. Узняўся вясёлы пярэпалах. Басілка ў хату ўцякла, за печ схавалася. Таргаваліся-дамаўляліся сваты з бацькам-маці. Нарэшце паладзілі.

Зайгралі тут валыншчыкі, сабраўся народ, карагод-кола завялі. Сватоў ды жаніха віном частуюць. Басілка з-пад доўгіх вейкаў крадком на жаніха паглядвае — відаць, спадабаўся ён ёй. Пра свае маністы яна і думаць забылася, ляжаць яны, кінутыя пад яварам. Сілян-бусел ціхенька дзюбай іх з зямлі падняў і ў гняздо занёс.

Раптам чуе, у свірне жонка яго Нэда плача-прымаўляе:

— У доме весялосць, а ў нас з табою, сыночак мой Велка, на сэрцы гора горкае. Быццам дзве травінкі мы пры дарозе — я без мужа, ты без бацькі.

Чуе Сілян, як Велка матцы адказвае:

— Не гаруй, не бядуй гэтак, мама, мо яшчэ вернецца бацька.

— Ох, не вернецца ён! Казалі людзі, перадавалі, што паплыў ён на караблі за мора, а карабель той разбіла на трэскі. Лягчэй бы ў мяне на сэрцы было, каб я сама яму вочы закрыла. Хадзілі б мы з табой на яго магілку, кветкі насілі б, зярняткі птушкам пасыпалі б.

Крыкнуў бы тут Сілян з даху: «Жывы я, жывы!» — ды няма ў бусла мовы.

Ідзе час. Ужо збажыну сабралі. Дні яшчэ цёплыя, а ночы халаднаватыя. Падгаілася ў бусла выцятая нага, толькі трошкі накульгвае.

Сястра Басілка да вяселля рыхтуецца, святочныя ўборы шые. Жонка Нэда чорнымі ніткамі ўдовіну кашулю сабе вышывае. Неяк раз адкаціўся клубок нітак убок. Нэда не прыкмеціла. Сілян-бусел і яго ў гняздо занёс.

Не дачакаўся Сілян вяселля. Надышла восень, а з ёю прыйшла пара ляцець буслам у вырай. Сабралася чарада на рачным беразе, узнялася і паляцела на свой востраў. А Сілян што? Што ж Сілян — сэрца



яго ў родным доме засталося, а сам паляцеў услед за чарадою на бусліны востраў, дзе заўсёды цёпла.

Жыве Сілян на востраве, усім людзям-буслам памочнік, на любой рабоце найпершы працаўнік. А сам дзянькі лічыць. Да той хвіліны, як усе жыхары паселішча зноў у бусліны ручай акунуліся, налічыў Сілян крыху больш за чвэрць года, крыху менш за паўгода.

На гэты раз збаночак з чалавечай вадой паўней наліў, мацней на шыю яго прывязаў. А як спускаўся на родны двор, ледзь-ледзь крыламі махаў, як мага асцярожней на зямлю садзіўся. За свіран зайшоў, чалавечай вадою апырскаўся, зноў Сілянам зрабіўся.

Рыжы сабака Лісок убачыў яго, забрахаў.

Сілян яму кажа:







— Што ж ты, Лісок, гаспадара не пазнаў?!

Родныя пачулі яго голас, выбеглі, кінуліся абдымаць. Плачуць і смяюцца. А Велка скача навокал, звонкім голасам крычыць:

— Мама, мама, казаў я табе, што бацька вернецца!

Бажын нагнаў гарэлкі-ракіі з найлепшага збожжа, хацеў сына пачаставаць, але Сілян і кропелькі ў рот не ўзяў.

— Даў зарок моцных напіткаў у рот не браць,— сказаў.

Тлустага барана зарэзалі, засмажылі, паклікалі



гасцей. Елі-пілі, Сіляна распытвалі, дзе быў-пабываў, куды хадзіў, што бачыў.

Сілян расказвае, а яму не вераць. Тут Сілян, трошкі накульгваючы, па маснічынах прайшоўся, у бацькі свайго Бажына спытаў:

— А памятаеш, як ты ў мой бок грудкай кінуў ды незнарок па назе мне пацэліў? З таго часу і кульгаю.

Змоўклі ўсе, задумаліся. А Сілян, ні слова не кажучы, выйшаў на двор, лескі прыставіў да свірна і дастаў са свайго гнязда сестрыны маністы ды клубок

чорных нітак. Тут ужо ўсе Сіляну паверылі. Дзіву даліся, загаварылі-загаманілі, а самыя старыя прыгадалі: калі іхнія дзяды малымі дзецьмі былі, прапала ў сяле некалькі хлопчыкаў і дзяўчынак. Хто казаў тады, нібыта цыганы іх з табарам звезлі, хто — нібыта ў рэчцы ўтапіліся. Ажно яно вунь што аказваецца!..

Буслоў і раней у сяле не крыўдзілі. А цяпер і зусім за сваіх лічаць. Дзецям з самага маленства наказваюць, каб не ганялі, камянямі ў іх не кідалі, гучным крыкам не палохалі.

А Сілян доўга і шчасліва жыў і ўнукам пра свае прыгоды ды нягоды расказваў.





Издание для детей и юношества

**АИСТИНЫЙ ОСТРОВ**

**Болгарская сказка**

Для дошкольного возраста

Минск, издательство «Юнацтва»

На белорусском языке

Выданне для дзяцей і юнацтва

**БУСЛІНЫ ВОСТРАЎ**

**Балгарская казка**

Загадчык рэдакцыі У. І. Карызна. Рэдактар Н. І. Мірончык. Малодшы рэдактар Н. А. Грышкова. Мастацкі рэдактар Ю. Ц. Цярэшчанка. Тэхнічны рэдактар С. А. Абрамчук. Карэктар Л. С. Мануленка.

ІБ № 1439

Здадзена ў набор 11.10.89. Падпісана да друку 05.04.90. Фармат 70×90[1]/16. Папера афс. № 1. Гарнітура тып Таймс. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 2,34. Ум. фарб.-адб. 9,94. Ул.-выд. арк. 1,49. Тыраж 100 000 экз. Зак. 2964. Цана 20 к.

Выдавецтва «Юнацтва» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

20 к.